# СІСТЭМНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ў 1921-1939 гг.

В.П. Гарматны
*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск, Беларусь*

У выніку падпісання 18 сакавіка 1921 г. Рыжскай мірнай дамовы амаль палова беларускіх зямель апынулася ў складзе Польшчы (II Рэчы Паспалітай). Паводле сельскагаспадарчага перапісу 1921 г. бяднейшыя слаі сялянства (з надзелам да 10 га) налічвалі ў Заходняй Беларусі 284 706 двароў, што складала 80,15% агульнай колькасці насельніцтва. Сярэдні памер зямельнага надзела такіх сялян складаў 4,93 га. 5,78% сялянскіх гаспадарак мелі зямлі менш за адзін гектар, 7,9% – ад 1 да 2 га, а ў гэты ж час 5987 мясцовых памешчыкаў валодалі 2 948 305 га зямлі (55,21% зямельнага фонду).

Тэрыторыя Заходняй Беларусі ўвайшла ў склад чатырох ваяводстваў: Палескага, Навагрудскага, Віленскага і Беластоцкага. На гэтыя землі польскія ўлады на падставе закона аб асадніцтве ад 17 снежня 1920 г. пачалі перасяляць вайсковых асаднікаў (перасяленцаў-каланістаў з карэннай Польшчы, якія пад час савецка-польскай вайны 1919-1921 гг. ваявалі ў шэрагах Войска Польскага) [7, s. 268; 9, s. 433]. У распараджэнні старшыні Галоўнай зямельнай управы ад 23 сакавіка 1921 г. тлумачылася, каго закон разумеў пад салдатамі польскай арміі – гэта шэрагоўцы, афіцэры, генералы, служачыя польскай арміі і падраздзяленняў добраахвотнікаў (апалчэнцаў), якія неслі вайсковую службу не менш чатырох месяцаў – усе яны мелі права на бясплатнае атрыманне асады (надзела зямлі на "Крэсах Усходніх"). Згодна з законам, не маглі атрымаць зямлю салдаты, якія былі пакараны за дэзертырства, злачынства супраць узброеных сіл польскай дзяржавы ці тыя, хто самавольна бралі ў карыстанне чужыя землі [2, с. 68-69].

У планах сістэмнай трансфармацыі сельскай гаспадаркі (на аснове законаў аб аграрнай рэформе, прынятых Сеймам Другой Рэчы Паспалітай 7 мая 1920 г. і 10 студзеня 1922 г.) [5, 1920, № 42; 1922, № 10] прадугледжвалася ліквідацыя сервітутаў (сумеснага зямельнага карыстання сялян і памешчыкаў) добраахвотным ці прымусовым шляхам. Сяляне пазбаўляліся адвечнага права карыстацца агульнымі пастбішчамі, выганамі, збіраць у лесе грыбы і ягады і г. д. За талон на права збору грыбоў, ягад і нават моху вяскоўцам патрэбна было заплаціць па 2-3 і болей злотых. Калі ж ляснік лавіў селяніна ў лесе і той не меў талона, то за гэта бралі вялікі штраф. Варта адзначыць, што сяляне знайшлі выйсце з гэтай сітуацыі – куплялі сумесна на вёску некалькі такіх талонаў і хадзілі ў лес па чарзе.

Пры правядзенні аграрнай рэформы дзяржаўцы імкнуліся перадаць сялянам замест сервітутных зямель раўназначны надзел такіх жа памераў ці меншы, але з лепшаю якасцю зямлі. Нягледзячы на гэтыя намаганні, усё роўна пры ліквідацыі зямельных сервітутаў польскім уладам не ўдалося пазбегнуць канфліктаў з мясцовым сялянствам [1, с. 36]. Такім чынам, ліквідацыя сервітутаў стала самай супярэчлівай часткай сістэмнай трансфармацыі сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі – з аднаго боку, ўпарадкоўваліся зямельныя адносіны, але з другога боку, парушаўся звыклы лад жыцця заходнебеларускай вёскі (асабліва на Палессі, дзе асабістыя сялянскія надзелы выступалі ў якасці дадатка да сервітута) [2, с. 88]. Сялянам станавілася вельмі цяжка трымаць каня, карову і нават свойскіх птушак.

Сялянства Заходняй Беларусі выступала рэзка супраць скасавання сервітутаў, бо пры гэтым страчвала значна больш, чым атрымоўвала ўзамен: каля 75% сервітутных зямель пераходзіла ва ўласнасць мясцовых памешчыкаў і асаднікаў, таму ліквідацыя сервітутаў праходзіла пераважна ў прымусовым парадку. З 1923 г. па 1938 г. 115 700 гаспадарак Заходняй Беларусі страцілі сервітуты, узамен якіх сяляне ў якасці кампенсацыі атрымалі 189 000 га зямлі і 127 100 злотых.

Погляды лідараў ПНП-"Пяст" ("людаўцаў") Вінцэнта Вітаса і ННС ("эндэкаў") Рамана Дмоўскага на аграрную рэформу не супадалі, з-за чаго ім не ўдалося стварыць кааліцыю ў Сейме 1922 г. Свае супярэчнасці выбітныя польскія палітыкі змаглі вырашыць 13 мая 1923 г. на сустрэчы ў Ланцкароне, маёнтку сенатара Людвіка Гамерлінга, дзе яны заключалі часовы і даволі нетрывалы кампраміс (так званы "Ланцкаронскі пакт") [4, s. 131; 7, s. 268]. На працягу 1925 г. канчаткова аформіўся саюз паміж ПНП-"Пяст" і ННС, да якіх далучылася ППС (PPS, Польская Партыя Сацыялістычная), якія імкнуліся вырашыць зямельнае пытанне ў краіне шляхам прыняцця і выканання закона аб аграрнай рэформе [3, с. 74].

У снежні 1924 г. урад Уладзіслава Грабскага (ННС) выступіў з новым законапраектам па аграрнаму пытанню, паводле якога прадугледжвалася адчужэнне без выкупу памешчыцкіх зямель Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на карысць вайсковых і грамадзянскіх асаднікаў [1, с. 29]. 26 ліпеня 1925 г. Сейм Другой Рэчы Паспалітай пры падтрымцы праўрадавых партый ППС і ПНП-"Вызваленне" адхіліў законапраект левых і прыняў "Закон аб правядзенні зямельнай рэформы" [6, s. 215], які ўвайшоў у гістарыяграфію як "Закон аб парцэляцыі і асадніцтве".

28 снежня 1925 г. Сейм II Рэчы Паспалітай прыняў канчатковы варыянт аграрнай рэформы [5, 1926, № 1; 9, s. 434]. Новы закон фактычна адмяніў зямельную рэформу 1920 г. і стаў асноваю далейшай аграрнай палітыкі. Аграрная рэформа складалася з насаджэння вайсковага і цывільнага асадніцтва, ажыццяўлення парцэляцыі (распродажу памешчыцкай зямлі невялікімі надзеламі – парцэламі), правядзення камасацыі (хутарызацыі) і ліквідацыі сервітутаў. Паводле закону "зямельнае ўпарадкаванне Рэчы Паспалітай Польскай будзе абапірацца на моцныя, здаровыя, здольныя да інтэнсіўнай вытворчасці гаспадаркі рознага тыпу і памераў, прадстаўляючыя прыватную ўласнасць іх уладальнікаў" [5, s. 2, art. 1]. Гэта азначала далейшую трансфармацыю сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі на капіталістычнай аснове.

Закон ад 28 снежня 1925 г. афіцыйна замацаваў механізм продажу памешчыкамі часткі сваіх зямель. Парцэляцыі падлягалі маёнткі, што належалі раней прадстаўнікам дынастый захопніцкіх дзяржаў, Рускаму Сялянскаму банку, царкве, ліквідаваным манастырам, іншаземцам, набытыя пад час вайны пры дапамозе ліхвярства і зямельнай спекуляцыі [1, с. 30]. Парцэляцыя магла праводзіцца прыватнымі асобамі і таварыствамі, але пад кантролем дзяржавы. Парцэляваная зямля вызначалася ўрадам на патрэбы "дробных гаспадарак", але толькі тых, якія ўжо маюць зямлю і сродкі яе апрацоўкі і здольны паспяхова весці далей гаспадарку (артыкул 51). Батракі распарцэляваных маёнткаў маглі набыць за грошы надзелы зямлі, якія яны раней апрацоўвалі, альбо кампенсацыю ад сваіх былых уласнікаў у памеры 500 злотых. Праз месяц пасля спынення працы ў памешчыка батракі павінны былі вызваліць свае пакоі.

Парцэляцыя павінна была праходзіць дабраахвотна, але не бясплатна – разглядаемы закон дапушчаў магчымасць адчужэння прыватных зямель праз выкуп па кошту, вызначаным урадам, прадугледжваў пашырэнне прывілеяў памешчыкаў і свабодны продаж зямлі па рынкавым кошце [3, с. 75].

Памешчык меў права самастойна выбіраць надзел зямлі пад правядзенне парцэляцыі – зразумела, што гэта была зямля горшай якасці. Законам прадугледжвалася парцэляцыя 200 000 га зямлі штогод (на працягу першых дзесяці гадоў, артыкул 11). Калі на працягу года ў краіне прадавалася менш 200 000 га памешчыцкай зямлі, то дзяржава прымусова пускала на продаж частку земель буйных маёнткаў па рынкаваму кошту, каб сяляне набывалі штогод не менш 200 000 га. Парцэляваныя надзелы прадаваліся надзеламі да 20 га ў велікапольскіх землях і да 35 га ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне (артыкул 50, параграф 1).

Памешчыкі захоўвалі зямельны надзел у памеры 60 га каля прыгарадаў буйных гарадоў, а ў іншых раёнах Польшчы гэты памер складаў 180 га (артыкул 4). У сувязі з тым, што на "Крэсах" гаспадарка была больш экстэнсіўная і польскія памешчыкі разглядаліся ў якасці апоры цэнтральнай улады, то тут максімум складаў 300 га (калі у маёнтку налічваліся прадпрыемствы для перапрацоўкі сельгаспрадукцыі, то максімум павялічваўся да 1 000 га) [8, s. 302]. Разам з тым у законе адзначалася, што маёнткі высокай сельскагаспадарчай культуры, з пункту гледжання меліярацыі, прадукцыйнасці і тэхнічнай забяспечанасці, парцэляцыі не падлягалі. Уласнасцю памешчыкаў заставаліся таксама сады, лясныя масівы плошчаю звыш 50 га (на "Крэсах Усходніх" – звыш 100 га), рыбныя сажалкі плошчаю звыш 3 га і іншыя вадаёмы – звыш 20 га. Агульная плошча зямель, не падлягаючых парцэляцыі, складала для ўсёй Польшчы 600 000 га.

Закон аб аграрнай рэформе 1925 г. у параўнанні з законам ад 15 ліпеня 1920 г. ствараў для памешчыкаў больш спрыяльныя асновы для парцэляцыі сваіх маёнткаў, але землеўладальнікі ўсё роўна выступалі супраць страты нават часткі сваіх зямель.

Новы аграрны закон прымаўся ў Сейме ва ўмовах жорсткай міжпартыйнай барацьбы і не быў канчаткова распрацаваны. Як пісаў былы міністр аграрных рэформ Вітольд Станевіч: "закон ад 28 снежня 1925 г. недастатковы і, здаецца, незадавальняе нікога ні справа, ні злева; ён з'яўляецца вынікам вызначанага кампраміса, дасягнутага ў надзвычай жорсткай барацьбе" [2, с. 136].

У плане сістэмнай трансфармацыі сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі прадугледжвалася ліквідацыя цераспалосіцы (камасацыя), што азначала правядзенне масавай хутарызацыі сялянскіх гаспадарак. 31 ліпеня 1923 г. Сеймам выдадзены закон аб камасацыі, але масава яна стала праводзіцца толькі з 1927 г. Для ажыццяўлення работ па правядзенню камасацыі ўлады падбіралі вопытных і спрактыкаваных людзей, пераважна з былых афіцэраў, для якіх адкрываліся 6-месячныя курсы падрыхтоўкі землямераў. Акрамя таго, матэрыяльна заахвочваўся ўдзел у правядзенні камасацыі мясцовых навучэнцаў дарожна-будаўнічых і іншых інжынерных школ.

Сяляне павінны былі плаціць за камасацыю кожнага гектара зямлі ў залежнасці ад яе якасці ад 14 да 20 злотых, а таксама за складанне праектаў меліярацыі, утрыманне землеўпарадчыкаў, перанясенне дарог і г.д. Таму камасацыя першапачаткова праходзіла марудна. З мэтаю паскарэння хутарызацыі 14 студзеня 1927 г. выдадзена сумеснае распараджэнне Міністэрства зямельных рэформ і Міністэрства фінансаў аб аказанні дапамогі сялянам, якія выходзілі на хутары. На 15-гадовы тэрмін выдаваўся крэдыт: 1 200 злотых на перанос будынка і 600 злотых на меліярацыю [9, s. 447].

Да восені 1939 г. на хутары ў Заходняй Беларусі выйшла 259 000 (больш 40%) сялянскіх гаспадарак. Камасацыя была прагрэсіўнаю з'яваю – садзейнічала ліквідацыі цераспалосіцы, стала лагічным працягам сталыпінскай аграрнай рэформы. Пераход на хутары дазваляў сялянам палепшыць апрацоўку сваёй зямлі, зменшыць колькасць неабходных для яе апрацоўкі працадзён і ўзняць прадукцыйнасць сельскай гаспадаркі.

З ажыццяўленнем польскімі ўладамі ў міжваенны перыяд сістэмнай трансфармацыі сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі паскаралася эканамічная дыферэнцыяцыя мясцовага сялянства і масавае разарэнне яго беднейшай часткі, што было заканамерным і непазбежным вынікам развіцця капіталістычных адносін. У выніку рэалізацыі аграрнай рэформы памешчыкі хутчэй уцягваліся ў капіталістычныя адносіны, акрамя таго парцэляцыя дапамагала заможным сялянам ствараць асабістыя фермерскія гаспадаркі па прускаму варыянту.

Праведзеныя польскімі ўладамі ў 1920-1930-х гг. у рамках сістэмнай трансфармацыі сельскай гаспадаркі мерапрыемствы часткова абмежавалі памешчыцкае землеўладанне – за 1921-1929 гг. у заходнебеларускіх ваяводствах яно скарацілася прыкладна на 13%, а за 1930-я гг. – яшчэ на 3,7%. У выніку некаторага памяншэння памешчыцкага землекарыстання і значнага абмежавання землеўладання сельскай буржуазіі ўзніклі ўмовы дзеля больш хуткага і паспяховага развіцця капіталізму ў заходнебеларускай вёсцы. Разам з тым памешчыцкае землеўладанне захоўвалася, што спрыяла павелічэнню зямельнага голада ў бядняцкіх гаспадарках, колькасць якіх вырасла: калі ў 1921 г. беднякі складалі 62%, серадднякі – 30%, заможныя – 8% заходнебеларускіх сялян, то ўжо на сярэдзіну 1930-х гг. адпаведна 78-80%, 15-17% і 5%.

Аб зменах, якія адбыліся ў становішчы заходнебеларускіх сялян у міжваенны перыяд, можна атрымаць уяўленне з наступнай табліцы.

### СТРУКТУРА ЗЕМЛЕКАРЫСТАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ ПА ПАМЕРАХ ГАСПАДАРКІ (1931 г.) [1, с. 40]

| групоўка гаспадарак па колькасці належачай ім зямлі, га | у 1931 г. | | рост ці памяншэнне ў параўнанні з 1921 г., % |
|---|---|---|---|
| | колькасць гаспадарак, тысяч | адносная колькасць гаспадарак, % | |
| менш 2 га | 57,0 | 10,3 | +15,6 |
| 2 – 5 | 191,2 | 34,5 | +52,1 |
| 5 – 10 | 165,2 | 29,8 | – 0,5 |
| 10 – 15 | 46,7 | 8,4 | няма дадзеных |
| 15 – 50 | 26,8 | 4,8 | +48,9 |
| звыш 50 | 3,2 | 0,6 | – 11,1 |
| гаспадаркі вайсковых асаднікаў | 7,0 | 1,3 | няма дадзеных |
| невядомыя гаспадаркі | 57,2 | 10,3 | няма дадзеных |

Такім чынам, сістэмная трансфармацыі сельскай гаспадаркі праводзілася ў Заходняй Беларусі з мэтаю адраджэння разбуранай Першаю сусветнаю (1914-1918 гг.) і савецка-польскай (1919-1921 гг.) войнамі вытворчасці краю. Аграрная рэформа польскіх улад, праведзеная ў 1920-1930-х гг., расчышчала шлях развіццю капіталізма ў заходнебеларускай вёсцы і садзейнічала павышэнню таварнасці сельскай гаспадаркі. Акрамя таго, адначасова з правядзеннем аграрнай рэформы польскія ўлады праводзілі і палітыку каланізацыі Заходняй Беларусі праз насаджэнне на свабодных мясцовых ворных землях вайсковых і цывільных асаднікаў.

Дзякуючы правядзенню польскімі ўладамі мэтанакіраванай сістэмнай трансфармацыі сельская гаспадарка Заходняй Беларусі ўжо ў 1929 г. дасягнула даваеннага (1913 г.) ўзроўню развіцця, а потым і значна пераўзышла яго. У вёсцы павялічылася

колькасць сельскагаспадачых машын, пашырылася сфера ўжывання штучных угнаенняў. Разам з тым у выніку дэмаграфічных працэсаў (перанаселенасць вёскі), застою ў прамысловасці, усеагульнага беспрацоўя ўзрастала колькасць дробных гаспадарак і сялянскай беднаты. Аграрная рэформа 1920-1930-х гг. не была даведзена да канца (яе ажыццяўленне спыніла Другая сусветная вайна) і таму не змагла канчаткова вырашыць зямельнага пытання ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд.

## ЛІТАРАТУРА


1. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.) / Б.Е. Кухарев. – Минск: Вышэйшая школа, 1975. – 112 с.
2. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968. – 204 с.
3. Титова, А.А. Позиция Польской Социалистической Партии по вопросу аграрной реформы в 1924-1925 годах / А.А. Титова // Советское славяноведение, 1984. – № 6. – С. 72-76.
4. Brzoza, Cz. Polska w czasach niepodleglosci i Drugiej Wojny Swiatowej (1918-1945) / Cz. Brzoza. – Krakow: Fogra, 2001. – 424 s.
5. Dzięnnik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej – [Warszawa]; Kancelaria Prezesa Rady Ministrow, 1926. – № 1. – S. 2-19.
6. Historia chlopow polskich / pod redakcja Stefana Inglota. – Wroclaw, Wydawnictwo Uniwersytetu Wroclawskiego, 1995. – 395 s.
7. Jezierska, A., Leszczynska, C. Historia gospodarcza Polski / A. Jezierska. – Warszawa, Key Text, 1999. – 560 s.
8. Kostrowicka, I., Landau, Z., Tomaszewski, J. Historia gospodarcza Polski XIX i XX wieku / I. Kostrowicka. – Warszawa: Ksiaska i Wiedza, 1975. – 590 s.
9. Odlanicki-Poczobutt, St. Wojewodztwo Nowogrodzkie / St. Odlanicki-Poczobutt. – Wilno: Nakladem Wilenskiej Izby Rolniczej, 1936. – 498 s.


## GORBACZOW – WOKÓŁ OKRĄGŁEJ ROCZNICY (PRÓBA PRZYPOMNIENIA)


Bartłomiej Garczyk
*Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu, Polska*


W marcu bieżącego roku minęła 25 rocznica nominacji Michaiła Gorbaczowa na stanowisko sekretarza generalnego KC KPZR. Mimo, iż od tamtego wydarzenia minęło ćwierć wieku, problematyka dezintegracji Związku Radzieckiego i państw bloku socjalistycznego – a w efekcie rozpad *bipolarity* – nadal wywołują dyskusje. Gorbaczow przyczyniając się do zmiany konstelacji politycznej świata, przeszedł tym samym do annałów historii, stając się jednym z głównych autorów historycznych przemian XX wieku. Można spotkać się również z twierdzeniem, że jeśli jednostka może mieć wpływ na bieg historii to niewątpliwie był nią on [4]. Dzisiaj, mimo ukończenia blisko osiemdziesięciu lat, ostatni przywódca ZSRR nadal uczestniczy w życiu publicznym oraz politycznym, choć jego działalność została mocno zmarginalizowana. Niemniej jednak, Gorbaczow pełni funkcję honorowego przewodniczącego Rosyjskiej Partii Socjaldemokratycznej; jest założycielem międzynarodowej organizacji ekologicznej